Цана асобнага нумару 20 гр.

Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 27 Вільня, Чацьвер 10 Верасьня 1931 г. Год VII (XV)

Беларуская Крыніца

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Шукаюць выхаду.

Пару тыдняў таму газэты многа пісалі аб тым, што беларускія сяляне цэлымі масамі пачалі ўцякаць у Саветы. Трэба тут адзначыць, што гэтыя „ўцекі" маюць большае і глыбейшае значэньне, чым гэта пісалі польскія газэты і затым мы аб іх шырэй пагаворым, выказваючы пры гэтым так-жа прычыны гэтага дзіўнага на першы пагляд зьявішча.

Прадусім, як-жа прадстаўляюцца самыя „ўцекі" нашых сялян у саветы?

„Kurjer Wileński" з 26.VIII. сёл. г. піша, што пераходзіць пачалі ўжо пару тыдняў таму (значыць каля 10.VIII.), спачатку пааднаму, а потым цэлымі групамі па 20 чалавек разам з коньмі, а апошнім часам нават яшчэ большымі групамі. Найбольшай групай сяляне пераходзілі граніцу ўночы з 21 на 22. VIII. каля Докшыц.

„Dziennik Wilenski" (№ 192) піша, што сяляне ішлі групаю болей сотні чалавек. Калі гэтая група была ўжо блізка граніцы, павадыр даў знак рассыпацца ланцугом пааднаму і якбы фронтам ісьці ў кірунку граніцы. Аднак польскія стражнікі зглядзелі і адкрылі агонь па ўцекачох ня толькі з карабінаў звычайных, але нават з кулямёту. У рэзультаце было 4 забітых (у гэтым адна маладая дзяўчына) і некалькі раненых. Польскія стражнікі арыштавалі 9 сялян і 5 дзяўчат, а рэшта ўцякла за граніцу,

Гэтак апісвае польская прэса, а цяпер прыглядзімся як выглядаюць гэтыя выпадкі ў асьвятленьні савецкай прэсы.

„Dzien. Wil". (№ 198) падае афіцыяльны савецкі камунікат з 26.VIII, у каторым гаворыцца, што ў апошнім часе пачаўся масавы пераход на савецкі бок уцекачоў з Польшчы. У апошніх 10 днях (г. зн. ад 16 да 26.VIII.) перайшло граніцу і было затрымана у Г.П.У. ў Менску (палітычнай паліцыяй) больш 500 асоб. Дня 17.VIII. у раёне Пляшчэніц перайшлі граніцу дзьве групы лікам 163 чалавекі, пры гэтым яны мелі на чале баёўку, каб на выпадак спатканьня з польскай пагранічнай стражай магчы сілай перайсьці на савецкі бок. А 19.VIII, як далей падае савецкі камунікат, у гэтым-жа раёне перайшлі на савецкі бок 3 групы лікам 147 чалавек. Яны пераходзілі пад агнём польскай пагранічнай стражы, якая прасьледавала бягучых аж на савецкую тэрыторыю, пры гэтым былі кінуты польскімі стражнікамі дзьве гранаты, якія разарваліся ўжо на тэрыторыі Б.С.С.Р.

Цяпер, калі мы ўжо ведаем, што піша аб гэтым польская і савецкая прэса, мы спытаемся, якія-ж прычыны маглі выклікаць такі масавы і маніфэстацыйны пераход нашых сялян у саветы?

Польскія газэты пішуць, што да гэтага пераходу прычынілася варожая агітацыя з боку камуністаў, якія цьвердзілі, што ў саветах не хватае работнікаў і што ім патрэба каля 8 тысяч людзей, у веку ад 20 да 30 гадоў. З гэтай мэтай камуністы закладалі на нашых землях тайныя наборныя пункты і потым цэлымі партыямі адсылалі работнікаў заграніцу.

Нам здаецца, што ў гэтым усім ёсьць пэўная доля праўды, але ня ўся. Трэба ведаць, што наш народ ужо здаўных шукае выхаду з труднага палажэньня і пакуль што яго не знаходзіць. Пасьля выбараў у 1922 годзе народ думаў знайсьці выхад у здабыцьці, пры помачы сваіх паслоў, аўтаноміі і тут у аўтанамічнай беларускай рэспубліцы завесьці новы лад, абапёрты на зямельнай рэформе, сваім школьніцтве і г. д. Аж гэтыя надзеі ня зьдзейсьніліся, тады ён масава пайшоў у „Грамаду", спадзяючыся пры помачы Ўсходу адваяваць для сябе лепшую долю. Але калі і „Грамада" не дала таго, чаго жадалася беларускім масам (зямлі, асьветы і волі) і калі труднае палажэньне разам з безрабоцьцем дайшло да нябывалай вышыні, наша сялянства пайшло беспасрэдна на ўсход, шукаючы там для сябе выхаду...

Прычыны гэтыя для нас так ясныя і зразумелыя, што дзівіцца трэба чаму іх ня бачыць польскае грамадзянства. Але ёсьць сьляпыя, каторыя ня могуць бачыць, а ёсьць сьляпыя, каторыя ня хочуць бачыць, дык мы аб гэтай сьлепаце польскага грамадзянства (на чале з Ул. Студніцкім з абшарніцкага „Слова") гаварыць ня будзем і пакінем яго ў тужлівым выгляданьні таго мамэнту, калі патрапіць „стравіць" беларускі народ.

Мы лепш зьвернем увагу на адну рэч якая кідаецца ў вочы пры абсьледаваньні справы пераходу нашага сялянства на савецкі бок — гэта на **маніфэстацыйны** характар гэтага пераходу. Сяляне, як піша польская і савецкая прэса, мужчыны і жанчыны, ішлі цэлымі групамі, ішлі рассыпаўшыся ланцугом, творачы як бы адзін суцэльны фронт, ішлі проста на польскіх стражнікаў, гатовыя на ўсё... Чаму яны ня йшлі па аднаму, незаметна, крадучыся, як гэта заўсёды робіцца пры пераходзе граніцы?

З аднаго боку мы бачым тут злую волю камуністычных павадыроў, якія на праліцьці беларускай сялянскай крыві хочуць зрабіць для сябе палітычны інтэрас, а з другога боку бачым, якая вялікая безнадзейнасьць у палепшаньне жыцьця і які вялікі адчай апанаваў беларускія масы, што гатовы йсьці пад кулі добраўзброеных пагранічнікаў!

Гэты факт сьведчыць, што ў нашым народзе ня толькі не аслабела актыўнасьць, як гэта любяць цьвердзіць польскія публіцысты, але наадварот, гэта актыўнасьць узмаглася, „Kur. Wil." (№ 195) апісваючы гэтыя падзеі цьвердзіць, што камуністы, нагаварваючы нашых сялян уцякаць у саветы, паміж іншым казалі, што яны, сяляне, прыдуць назад... Як-жа уцекачы разумелі гэты прыход назад? — пытае тая-ж газэта. А вось як: з іх утворыцца беларускі бальшавіцкі легіон, які прыдзе назад першы, а за імі бальшавікі. Потым бальшавікі і палякі адступяць з гэтых мясцовасьцяў і тут будзе Беларусь пад эгідай (павадырствам) Савецкай Расеі... Гэтак перадае „Kurjer Wilenski".

З гэтага відаць, што агітацыя за пераход граніцы ішла ня так па камуністычнай, як па нацыянальнай лініі, бо праводзілася тут думка аб нацыянальна незалежнай Беларусі. Ці гэтак гаварылі камуністы, як піша „Kur. Wil.", гэта другая справа, але гэтак, а ня йнакш зразумелі тыя, што ўцякалі ў саветы. А гэта яшчэ раз сьведчыць аб тым, што беларускія масы, па ўсіх блуканьнях, канешне хочуць знайсьці **правільны** выхад.

Барацьба за Царкву.

Адным з галаўнейшых заданьняў для беларускае інтэлігенцыі ў наш час зьяўляецца барацьба з усім тым, што накінула нам шматвяковая няволя Маскоўшчыны. Астаткі гэтага мы можам спаткаць сяньня яшчэ на кожным кроку. Калі мы возьмем прыкладам рэлігійнае жыцьцё народу, то ўжо і тут убачым сьлед гэтага панаваньня. Царскія ўлады ў сваёй русафільскай рабоце ня спыняліся ні прад чым. Духоўніка пасыланага на нашы землі рабілі платным агентам русафікатарства і дагляду „благанадзёжнасьці". У народзе сьведама пашыралі ману, рэлігію акрэсьліваючы народнасьцю. Да сяньняшніх часоў захавалася яшчэ ў народзе гэткае тлумачэньне — я польскай веры, а ты рускай веры.

Расейская Праваслаўная Царква ўсёцэла аддалася на ўслугі палітыцы маскоўскага народу. Даваенная кансысторыя на нашых землях і падуладнае яму духавенства гэта нішто іншае, як экспозытуры жандармшчыны. Народ, бачучы ўсё гэта, зусім адасобніўся ад духавенства, пачаў жыць сваім собскім жыцьцём. Па старой прывязанасьці ён часамі яшчэ і наведываў царкву, але цікавіла яго ўжо тут ня тое, аб чым вучыў сьвяшчэннік, а старана чыста вонкавая, абрадавая. Духавенства састаўляла „едино стадо", але не з паствай сваёй, а з жандармшчынай і ўрадоўцамі.

І вось пасьля сусьветнай вайны, расейскае духавенства астаўшыся і надалей у нашым народзе, ніякім чынам ня можа выбыцца памяці даваенных „добрых" часоў, усьцяж вернае ідэалам і палітыцы даваеншчыны. Жыцьцё аднак пайшло наперад і сяньня патрэба не жандарма ў расе, а сапраўднага пастыра, які мовай і крывёй павінен быць цесна зьвязаны з народам, каб магчы даць належны адпор наступаючаму бязьверру і сэктанству. Тымбольш, што народ добра памятуючы нягоднасьці даваеншчыны ўжо сяньня добра ўсьведаміўшы сваё нацыянальнае „я", зусім здэцыдавана і варожа выступае супроць сучаснага духавенства і яго русафільскіх імкненьняў, паддаючыся часта ахвотна усялякім уплывам ворагаў хрысьціянства. Праўда, старэйшае пакаленьне яшчэ па інэрцыі цягнецца ў царкву, але і то толькі каб пабачыць абрады і фэсты. Малодшае пакаленьне, якое сяньня і падпадае часам пад уплывы атэізму, аднак усільна шукае не бязверра, а зусім наадварот, веры аб чым найлепш можа сьведчыць пашырэньне ў апошнія часы на нашых землях розных сэктаў рэлігійных.

Пачынаецца цяпер такім чынам шуканьне такое веры і царквы, якія далі-б маральнае задаваленьне для тэй часткі маладога праваслаўнага пакаленьня, якому Прав. Царква не патрапіла даць ня толькі нічога, але нават выклікала да сябе варожасьць. Трэба думаць, што і сэктанства ня дасьць таго, чаго шукае душа маладога беларуса, бо яно зьяўляецца элемэнтам новым і народу нашаму чужым. Павінна тут прыйсьці такая Царква, аўтарытэт якой і мінуўшчына вядомы нашаму народу, Царква — якая падлягае не палітыцы цароў зямных, а заступніку Хрыста. Царквой гэткаю была-бы Царква Праваслаўная злучаная з Царквой Рымскаю пад главенствам Рымскага Архіпастыра. Яго аўторытэт ёсьць зарукаю таго, што Царква яго далёка непадобная да Царквы сяньняшняй Праваслаўнай, якая дайшла да таго, што мы сяньня зьяўляемся сьведкамі барацьбы сьвецкіх людзей за Царкву з слугамі гэтае Царквы, з кіраўнікамі яе духовага жыцьця, за чысьціню гэтага-ж жыцьця. Як не выглядае гэта неправўдападобным, аднак мы можам аб гэтым пераканацца хоць-бы ўзяўшы за прыклад судовую справу праваслаўнага беларуса студэнта Саркі, якая назначана ў Віленскім Акружным Судзе на 22 верасьня сёл. году.

Словам, мы, праваслаўныя беларусы, мусім імкнуцца да таго, каб адрадзіць свой народ рэлігійна і нацыянальна.

Міранін-Беларус.

Забойства пасла Т. Голувкі.

У суботу дня 29 жніўня с. г. каля 9 гадзіны ўвечары, ў Трускаўцы (Галіччына), у пэнсіонаце с. с. Базыльянак, нявыкрытыя дасюль напасьнікі застрэлілі ведамага і на беларускім грунце польскага пасла з Б.Б. Тадэўша Голувко.

Голувко ў Трускаўцу прабываў на адпыху каля трох тыдняў і найшоў памешканьне ды сталаваньне ў пэнсіонаце с. с. Базыльянак (Украінскі жаночы манастыр).

Польскія газэты падаюць, што Голувко прабываючы ў Трускаўцу вёў гутаркі з польскімі ўрадавымі кругамі, а так-жа і з некаторымі ўкраінскімі палітыкамі.

Прад крытычнай хвілінай — пасьля 7 гадзіны ўвечары—Голувко пашоў у свой пакой, раздзеўся, лёг у ложка і пачаў чытаць кніжку. На дварэ была страшная непагода: ліў навальны дождж і трашчэлі пяруны.

Каля гадзіны 8-ай ціха адчыніліся дзьверы і ў пакой да Голувкі ўвайшлі два маладыя мужчыны, якія падышоўшы да ложка некалькі разоў выстралілі ў ляжачага на ложку пасла.

Як выявіла пазьнейшая сэкцыя (лекарскі агляд), напасьнікі выстралілі ў Голувку 6 разоў. Усе стрэлы былі мэтныя. Дзьве кулі вынялі дактары з галавы забітага, дзьве з правага абойчыка, адну з плячэй, а шостай кулі з шчакі не выцягвалі, каб не апаганіць твару.

Сэкцыя выявіла, што страляні абодва напасьнікі, бо кулі былі двох калібраў.

У суседніх пакоях госьці пэнсіонату чулі стрэлы, але думалі, што гэта стрэлы пяруна. Прыпадкова адна пані спаткалася на калідоры пэнсіонату з забойцамі пасла Голувкі, якія пасьля дакананьня забойства ўцякалі з пакою Голувкі. Забойцы ўцякаючы з пэнсіону ня сходзілі па сходах удол (пакой, дзе забілі Голувку, быў на другім паверсе), а „зьяжджалі“ па парэ чы.

Забойцы выбегшы з пэнсіону, прабегшы каля пастарунку паліцыі, затрымаліся каля пошты, дзе чакаў іх таварыш. Гэты трэці быццам даў першым двум забойцам Голувкі другую вопратку. Забойцы пераадзеліся і некуды ўцяклі.

Першы пабачыў на вуліцы забойцаў Голувкі чыноўнік польскага банку. Забойцы беглі з рэвальвэрамі гатовымі да стрэлу. Чыноўнік спужаўся і ўступіў ім з дарогі.

Пасьля забойства зьявілася ў пэнсіонат паліцыя і ўлада судовая і распачалося сьледзтва. Сьледзтву перашкаджае вялікі ў той час дождж, які замыў сьляды. Нават паліцэйскі сабака і той адразу згубіў сьлед. Як відаць, дык і напасьнікі ўцякалі так, каб не пакідаць за саабой цяглых сьлядоў („зьяжджаньне“ па парэнчы).

Судовыя ўлады сьцьвердзілі, што прад забойствам адзін забойца ўскарабкаўся па слупе балькону аж да вакна пакою Гулувкі і разьведаў, ці Голувко ёсьць ужо ў пакою.

Пасол Голувко прайшоў у Сойм па сьпіску № 1 у Навагрудзкім вокрузе. У часе выбараў у 1930 годзе кіраваў на нашых землях выбарчай акцыяй Б.Б. У Сойме быў віцэ-старшынёй пасольскага клюбу Б.Б. Пасол Голувко быў адзін з найгарачэйшых санатараў і працаўнікоў з польскага боку дзеля стварэньня як украінскай, так і беларускай угоды.

У зьвязку з забойствам сьледчыя ўлады арыштавалі некалькіх асоб. Сьледзтва вядзецца далей.

Пахароны пасла Голувкі адбыліся ў Варшаве 1 г. м. Цела Голувкі з Трускаўца перавязьлі ў Варшаву і там пахавалі на кальвінскіх могілках, бо нябошчык пасол Голувк быў кальвінскага веравызнаньня.

Водгукі забойства Голувкі. Вестка аб забойстве пасла Голувкі выклікала вялікае ўражаньне. Нацыяналістычная польская прэса стараецца забойства Голувкі залічыць на рахунак украінцаў. Некаторыя польскія газэты сьцьвердзяць, што забойства Голувкі дакапалі чэбры УВО (нелегальная Украінская Вайсковая Арганізацыя).

Украінскія газэты „Діло“ і „Нова Зоря“ палітычнае забойства зганілі. Прэзыдыюм УНДО і Парлямэнтарнай Украінскай Рэпрэзэнтацыі аб'явілі, што не солідарызуюцца з такім спосабам палітычнай барацьбы і зганілі так-жа паступак забойцаў пасла Голувкі.

Прыпамінкі. Пасьля пахаронаў пасла Голувкі пачаліся ў Польшчы аб ім прыпамінкі. У многіх гарадох сарганізаваліся спэцыяльныя хаўтурна-прыпамінкавыя камітэты, якія ладзяць хаўтурныя акадэміі ў чэсьць Т. Голувкі. Гэткі камітэт паўстаў і ў Вільні. У склад яго ўвайшлі і прадстаўнікі ад беларускага „Цэнтрасаюзу“—Трэпка і Астроўскі. Віленскі камітэт наладзіў у суботу 5 г. м. жалобную акадэмію ў чэсьць Голувкі, на якой ад беларускага „Цэнтрасаюзу“ прамаўляў старшыня „Цэнтрасаюзу“ грам. Трэпка.

б.

З газэт.

Літоўцы аб Беларусах.

Выходзячая ў Латвіі беларуская газэта „Думка Беларуса“ у № 3 перадрукоўвае з літоўскай газэты „Musu Vilnius“ (№ 19 з дн. 10.VII. с. г.), якая выходзіць у Коўне, стацьцю аб Беларусах.

У гэтай стацьці ведамы літоўскі публіцыст Выгандас між пішa так:

„Супольнае жыцьцё літоўска-беларускіх часоў ня было замутнена ніякім сваркамі і нязгодамі. 25 сакавіка 1918 году беларусы ў сваім цэнтры — Менску абвесьцілі Беларускую незалежную рэспубліку. Быў створаны ўрад з вядомым дзеячом Ластоўскім на чале, але ворагі не далі новай рэспубліцы зарганізавацца. Урад беларускай рэспублікі быў змушаны ўцячы з свaёй тэрыторыі. Рыскі трактат у 1921 г. падзяліў Беларусь на палову. Адна палова з Менскам дасталася СССР і была арганізавана як савецкая Беларусь; другая палова — заходняя Беларусь — дасталася Польшчы.

Беларусь мае абшар каля трохсот тысяч кілямэтраў, а жыхароў беларускай нацыі лічыцца 8—10 мільёнаў. Савецкая Беларусь мае сваю асобную арганізацыю і ўваходзіць ў сувязь савецкіх рэспублік.

Пад Польшчай ёсьць каля 2 з паловай мільёнаў беларусаў на 50.000 кв. кіл. абшару. Тэорэтычна правы беларусаў гвараптаваны падпісанай Польшчай у Лігэ Народаў умовай і Рыскім трактатам. У Заходняй Беларусі было каля 400 беларускіх школ. Сяньня — засталося 20 школ і каля 40 школ мешаных-утраквістычных. Дзякуючы вялікаму абяднеьню беларусаў, яны ня маюць магчымасьці сваімі сродкамі пашырыць нацыянальную культуру. З 2 з палавінай мільёнаў беларусаў, якія знаходзяцца ў Польшчы, каля 1 з палавінай мільёна ёсьць праваслаўных і каля 1 мільёна каталікоў. Беларусы ня маюць ні каталіцкага, ні праваслаўнага сьведамага духавенства.(?) Гаспадарчае становішча беларусаў вельмі цяжкое.

Ад 1922—1927 г. беларусы мелі ў польскім Сойме 11 пасloў і трох сэнатараў; 1928—1930 г. 10 паслоў і 2 сэнатараў, а ў апошнія выбары правялі — 1 пасла і ніводнага сэнатара. Тымчасам, паводле ўсяго ліку, беларусы павінны былі мець 20 паслоў і каля 9 сэнатараў.

Беларусы, як і ўкраінцы, нашы натуральныя саюзьнікі“ і г. д.

У гэтай даволі абшырнай інфармацыйнай стацьці пан Выгандас ня сусім згодна з праўдай цьвердзіць, што Беларусы ня маюць ні каталіцкага, ні праваслаўнага сьведамага духавенства. Калі аб сьведамасьці сярод беларускага каталіцкага духавенства п. Выгандас нічога ня ведае, дык радзім прачытаць нядаўна выданую ў Вільні кніжку „Родная мова ў сьвятынях“ кс. Ад. Станкевіча, у якой гаворыцца аб дзейнасьці сьведамага беларускага каталіцкага духавенства. Пры гэтым трэба сказаць, што ёсьць сьведамых нацыянальна і сярод беларускага духавенства праваслаўнага. Але як каталіцкае так і праваслаўнае духавенства, маючы над сабою: адны—польскага біскупа, а другія біскупа расейца, ня могуць рабіць таго, што рабіць павінны.

У

Выпісывайце беларускія кніжкі па адрасу:

Кнігарня „ПАГОНЯ“ — Вільня, Людвісарская 1.

Нарады аб уніі ў Пінску.

Праз тры дні, ад 1 да 3 г. м. адбылася ў Пінску нарада аб уніі. На гэтую нараду зьехаліся біскупы і сьвяшчэньнікі ўсходняга і лацінскага абраду. Удзельнікаў гэтай нарады было 98 асоб: Палякі, Украінцы, Беларусы і Расейцы.

Пасьля нарады прыняты рэзалюцыі. У гэтых, вялікай вагі для справы рэлігійнай, рэзалюцыях знаходзім і такую пастанову: — „IV. Другая пінская уніяная канфэрэнцыя ўважае патрэбным адзначаць засаду натуральнага права і сталую практыку Касьцёла, каб у навучаньні Слова Божага ў каталіцкіх сьвятынях усходняга абраду, была ўжывана бацькаўская мова вернікаў, а іменна для Палякоў—польская, для Украінцаў— украінская, для Беларусаў — беларуская, для Расейцаў — расейская.“

Так, гэтага вымагае права натуральнае, гэтак наказвае рабіць Касьцёл — Царква, гэтага дамагаецца і звычайная справядлівасьць. Але ня ведама што на гэта скажуць і як вытлумачаць гэтую справядлівасьць тыя, ад каторых у вялікай меры залежыць рэалізацыя гэтых пастаноў.

З Беларускага жыцьця.

Пачатак навукі. Ува ўсіх беларускіх сярэдніх школах — у гімназіях: Віленскай і Навагрудзкай і ў вучыцельскай сэмінарыі ім. Ф. Багушэвіча ў Вільні школьныя заняткі ўжо пачаліся. Не распачаліся толькі заняткі ў Клецкай Беларускай гімназіі, лёс якой пакуль што ананчальна нявыяснены.

Вобыскі і арышты сярод вучняў Клецкай Бел. гімназіі. Нас паведамляюць, што 23.VIII. с. г. адбыліся сярод вучняў Клецкай Бел. гімназіі вобыскі і арышты.

Ліквідацыя прыватнай пачатковай беларускай школы. У Шаўлянах Браслаўскага пав. да гэтай пары пачатковая прыватная беларуская школа Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. Вучыцелькай гэтай школы была працавітая Мар'я Булыгава. На 1931-32 школьны год Браслаўскі інспэктар „зэ взглендув формальных“ вучыцелькі Булыговай не зацьвердзіў, а гэтым самым і ліквідуецца ў Шаўлянах беларуская школа. Цэнтральны Урад Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры прыціў гэтага падаў рэкурс у Кураторыю, але гэта хіба справы не паправіць.

Канфіската „Шляху Моладзі.“ Адміністрацыйныя ўлады дня 31.VIII с. г. сканфіскавалі № 8 за м-ц жнівень „Шл. Моладзі.“ Рэдакцыйная калегія адзінай беларускай часопісі для моладзі, якая выдае свой месячнік „Шл М.“ саматугам, не змагла паўторна пасьля канфіскаты выдаць нумару часопісі за жнівень і выпусьціла наступны нумар за м-ц верасень.

Кангрэс Нац. Меншасьцяў без прадстаўніка ад Беларусаў. На Кангрэс Нац. Меншасьцяў, які адбыўся 29, 30 і 31.VIII с. г. ў Жэнэве ад Беларусаў быў дэлегаваны пасол Ярэміч. Але пасол Ярэміч у Жэнэву не даехаў, бо ў дарозе раптоўна захварэў і мусіў палажыцца ў шпіталь лячыцца. Пасьля апэрацыі ў шпіталі ў Пазнані, пасол Ярэміч паздаравеў і вярнуўся дамоў.

Новая кніжка „Нябесныя Бегі“ Я. Драздовіча вышила з друку. Зьмест кніжкі—астранамічна-фантастычныя дагадкі.

Новая беларуская кнігарня. Нядаўна ў Вільні адчынілася яшчэ адна беларуская кнігарня. Такім чынам у Вільні цяпер ёсьць 4 беларускія кнігарні.

Будынак вучнёўскай бурсы, пры Навагрудзкай беларускай гімназіі, стаіць усьцяж яшчэ нявыканчаны і памалу ніпшчыцца ад вясеньніх даждЖоў. На да канчатнае будынку патрэбны невялікія ўжо толькі сумы: трохпавярховы будынак ужо выбудаваны пад страху, паложаны крэйкі і латы, астаецца толькі купіць бляху і пакрыць; ды і на гэта няма грошаў. Да рэчы трэба зазначыць, што Сойм у свой час быў асыгнаваўшы на будову гэтай бурсы 200 тысяч зл., а Урад выдаў толькі 60 тыс. зл.

З жыцьця Б. І. Г. і К. За м-ц жнівень віцэ-старшыня Цэнтр. Ураду Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры інж. Ад. Клімовіч злюстраваў провінцыянальныя Гурткі Інстытуту ў паветах: Стаўпецкім, Нясьвіскім, Ба-

З Літоўскага жыцьця.

Закрылі 8 школ. У Віл.-Троцкім, Лідзкім і Горадзенскім пав. польскія ўлады закрылі 8 літоўскіх школ, утрымліваных літоўскім школьным таварыствам „Рытас."

Не дазволілі адкрыць 16 школ. На просьбу літоўскага жыхарства адкрыць 16 новых літоўскіх школ, польскія ўлады адказалі адмоўна. Просьбы гэтыя паходзяць з рожных літоўскіх куткоў нашага краю.

Ня лепш, але горш. Літоўская віленская часопісь „Vilniaus Rytojus" у № 70 зьмяшчае гутарку з старшынёй т-ва „Рытас" праф. кс. П. Краўялісам аб літоўскай школьнай справе пад Польшчай. З гутаркі гэнай даведваемся, што справа гэта ўсьцяж пагаршаецца. Быў час — кажа старшыня, — што былі школы, але ня было вучыцялёў, а цяпер вучыцялі ёсьць, дык школаў няма. Польскія школьныя ўлады дараджаюць літоўцам рабіць рэдукцыю, гэта знача пакідаць літоўскіх вучыцялёў бяз працы ў школе.

З Украінскага жыцьця.

Арышты сярод Украінцаў. Газэты падаюць, што на тэрыторыі Львоўскага ваяводзтва дакanана многа арыштаў сярод Украінцаў. У Львове арыштавана 19 асоб, пераважна сярод моладзі. Масавыя арышты адбыліся на тэрыторыі капальні нафты, у пав. Яфораўскім і інш.

З Польшчы.

Бурлівы пачатак палітычнага сэзону. Пасьля летняга заціпша, калі ўсе палітыкі адпахнулі, пачаўся палітычны сэзон вельмі бурліва.

Неўспадзеўкі млявае летняе палітычнае жыцьцё раптам ажывілася пад уплывам трагічнай падзеі ў Трускаўцы.

Пасьля трагічнай сьмерці пасла Голувкі адбылася нарада найвышэйшых дзяржаўных дастойнікаў: — прэзыдэнта Мосьціцкага з марш. Пілсудскім і прэм'ерам Прыстарам. Пасьля гэтай нарады зьявіліся погаласкі, што мае быць склікана надзвычайная сэсія Сойму, але, як выясьнілася, гэта няпраўда, бо соймавая сэсія будзе склікана пасьля закончэньня сэсіі Лігі Народаў.

Калі гаварыць аб падзеях апошніх часоў у Польшчы, дык ня можна прамаўчаць новай, пасьля Дэмкоўскага, шпіонскай афэры, якую выкрылі у Берасьці: кіраўніка мобілізацыйнага рэфэрату паручніка Гумніцкага за шпіонства расстралялі.

Палявыя (даразныя) суды ўва ўсей Польшчы. Дня 4. г. м. зьявілася распараджэньне Рады Міністраў з 2 г. м., на падставе якога ўводзяцца палявыя суды ўва ўсей Польшчы. Распараджэньне аб палявых судох выдана на падставе дэкрэту з дня 15.III. 1928.

Міністэрства ўнутраных спраў распарадзілася, каб палявыя суды ўва ўсей Польшчы пачыналі сваю дзейнасьць ад 10 верасьня с.г.

Агульная перапісь насельніцтва. Сёлета дня 9 сьнежня адбудзецца агульная перапісь насельніцтва ўва ўсей Польшчы.

Сёлетняя перапісь будзе менш абшырнай ад перапісі 1921 г., не абыймае яна перапісі гаспадарак сялянскіх, лясных, супольных грунтоў і скаціны. Да перапісі ўжо падгатаўляюцца адпаведныя бланкі, якія будуць разданы перапішчыкам. Перапішчыкаў ува ўсей Польшчы будзе вызначана больш 50.000 асоб.

ранавіцкім, Наваградзкім і Ашмянскім. З праектаваных чатырох рэфэратаў, прачытаны быў толькі адзін: дня 15.8. с. г. ў Мядзьведзічах, Баранавіцкага пав.; там-жа адбылося і аматарскае беларускае прадстаўленьне. На рэшту адміністрацыйныя ўлады не далі дазволу (Ляхавічы — Баранавіцкага павету, дня 16.8.31 г., Шутавічы — Ашмянскага пав., 22.8.31 г. і Жодзішкі — Вялейскага пав., дня 23.8 31 г.) — Пры паўторных захадах быў сысканы дазвол на рэфэрат і беларускую вечарыну - прадстаўленьне ў м. Ляхавічах, Баранавіцкага пав. дня 30.8.31 г. — Зазначыць трэба, што тэмы ўсіх рэфэратаў былі выключна гаспадарча-коопэратыўныя.

З заграніцы.

Кангрэс Нацыянальных Меншасьцяў. У Жэневе 29, 30 і 31 жніўня с. г. адбыўся VII. Кангрэс Нац. Меншасьцяў. Кангрэс пасьля нарадаў прыняў рэзалюцыю ў справе ахароны правоў народных меншасьцяў, апэлююча да Лігі Народаў, каб яна зьвярнула ўвагу на гэтыя справы і дбала разглядала скаргі нацыянальных меншасьцяў. Рэзалюцыя гэта зьвязвае справу агульнага разаружэньня з разьвязкай праблемы нацыянальных меншасьцяў, без якой эўрапэйскі мір ня можа быць трывалы.

Ліга Народаў. Ад дня 1 г. м. пачалася ў Жэнэве 64 сэсія Лігі Народаў. Поруч з сэсіяй Лігі сабралася і г. зв. Эўрапэйская камісія, якая паўстала пасьля таго, як францускі міністр Бріян падаў ведамы праект панэўрапэйскай лучнасьці. Галоўнай справай гэтай камісіі быў праект савецкага камісара Літвінава аб гаспадарчай неагрэсіі між эўрапэйскімі дзяржавамі. Гэта справа перадана адумысловаму камітэту дзеля разгляду.

Скасаваньне Аўстрыйска-Нямецкага мытнага саюзу. Ведамы нашумеўшы на ўсю Эўропу Аўстрыйска-Нямецкі мытны саюз ужо скасаваны. Аўстрыя і Нямеччына, недачакаўшыся апініі аб гэтым саюзе Міжнароднага Трыбуналу ў Гаазе, адмовіліся праводзіць яго ў жыцьцё.

Канец дыктатуры ў Югаславіі. У апошнія часы югаслаўскі кароль аб'явіў новую конституцыю, якая варочае парлямэнтарны лад Югаславіі. Такім чынам дыктатура ў Югаславіі кончылася.

У Гішпаніі ўсё неспакойна. Камуністы арганізуюць маніфэстацыі падчас якіх даходзіць да крывавых сутычак з паліцыяй.

Апостальская Сталіца перамагла фашыстаўскі ўрад у Італіі. Фашысты пайшлі на ўступкі Апостальскай Сталіцы і навязваюць з Ватыканам добрыя адносіны.

Надзея.

Хмаркі цёмныя ў небе стаяць,
Вецер вее з дажджом ад заходу,
Сонца ў небе даўно ня відаць,
І надзеі няма на пагоду.

Тужыць ціха бядак селянін
І на долю сваю наракае;
Ня тужы, ты такі не адзін,
Доля ўсіх нас спаткала такая.

Усе мы роўна клянём цемнату,
Ўсе мы трацім ад тэй непагоды,
Ўсе мы роўна цярпім беднату
Для чужой непатрэбнай прыгоды.

Прыдзе дзень і ўсе хмары спадуць,
Вецер сьціхне з дажджом ад заходу
Уся нуда і бяда прападуць —
Сонца сьвет прынясе і пагоду.

Няведамы.

З краю.

Забаўка з сьмерцяй. Дня 23.VIII с. г. у двары Мільках, Едзкай гміны, Браслаўскага пав. здарыўся вельмі дзікі выпадак. Уласьнік двара пан Віктар Лісоўскі, з сваім лясьнікам Уладз. Прыстаўкай, наладзілі з стрэльбамі паляваньне на маладых хлапцоў. Убачыўшы, што вясковыя хлапцы пашлі ў панскі лес па арэхі, „паляўнічыя" — пан Лісоўскі з лясьнікам Прыстаўкам, пашлі за хлапцамі ў лес, падсачылі дзе хлапцы затрымаліся ў густым ляшчыньніку і як толькі хлапчукі пачалі шчыпаць арэхі, „паляўнічыя" пачалі ў іх страляць. Стрэл быў даволі мэтны, бо В. Лісоўскі адным выстрэлам палажыў на мейсцы трупам 17 гадовага хлапца Юльяна Мешкело. Мэтным стральцом В. Лісоўскім заапякавалася судовая ўлада і пасадзіла яго ў вастрог.

Ахвяры няшчаснага выпадку. Дня 28.VIII. с. г. у в. Густатох, Браслаўскага пав. здарыўся вельмі трагічны няшчасны выпадак. Раніцай, а гадзіне 8-й, з вёскі выбраліся на работу да суседняга двара Рафалова 3 хлапцы і 5 дзяўчат. Да Рафалова з Густат найпрасьцейшая дарога праз возера, дык і гэтыя 8 асоб селі ў лодку і паплылі па возеры ў напрамку Рафалова. Калі яны ад'ехалі далёка ад берагу, раптоўна паднялася бура і перавярнула лодку. Выкінутыя з лодкі ў ваду пачалі тануць. Пабачыўшы з берагу гэту трагэдыю Г. Запруднік пасьпяшыў з лодкай тонучым на помач і змог выратаваць 4 асобы, а рэшта — 4 асобы ўтанулі.

Да нас пішуць:

БЯСПЛОДНАЯ ПРАЦА.

Іказьнь, Браслаўскага пав. Наша каталіцкая парафія складаецца з адных Беларусаў, з маленькай дамешкай некалькіх шляхтуноў. Ксёндз-жа ў нас Паляк. Сучасны наш пробашч кс. Ганусоўскі прыехаў да нас гадоў чатыры таму і адразу пачаў між Беларусаў-каталікоў праводзіць польскую місію. Сьпярша залажыў ён „Стоважышэне Млодзежы Польскей,"упісаўшы туды моладзь і падросткаў шляхтуноў. Апрача гэтага пачаў ён пашыраць і польскую абшарніцкую газэту „Наш Пшыяцель." Здавалася, што работа польскае „місыйнасьці" наладжана. Але, як кажуць, шчасьце з няшчасьцем заўсяды ходзяць разам. Ні з сяго, ні з таго— трах і развалілася ксяндзоўская пляцоўка польскай місіі: шляхтуны паўцякалі з „Стоважышэньня", бо думалі, што ксёндз паўпісываў іх у сваю арганізацыю, каб з імі разам піць гарбату і прыглядацца на іхнія „панскія" выкрутасы. Але як даведаліся, што не на тэта яны патрэбныя ксяндзу, — пайшлі ў свой бок і голас ксяндза паляка стаўся голасам крычачага ў пустыні.

На гэтым аднак полёнізацыйнае вастрыё кс. Ганусоўскага ня ступілася. Ён абапёр сваю полёнізацыйную місію на элемэнце больш „пэўным" — на залежных ад сябе людзях: арганістым, закрыстыяне і арандатары. На гэтых „кітох" збудаваў у нас ксёндз паляк польскую пляцоўку „Стоважышэньне."

Гэты новатвор кс. Ганусоўскага ў Іказьні ўтрымаўся і „моцна" трымаецца. Але гэтая „арганізацыя" далей ксяндзоўскай кухні не сягае. За ўвесь час яе існаваньня, праз некалькі гадоў, пабольшылася яна толькі на аднаго сябру, бо ўпісалі ў рэестр ксяндзоўскага „Стоважышэньня" памоцніка закрыстыяна. Гэная „арганізацыя", ці проста — ксяндзоўскія слугі памагаюць ксяндзу раздаваць людзям „Нашага Пшыяцеля." На гэтым і канчаецца іхная праца. Карысьці з гэтай „работы" няма нікому: ані польскаму нацыяналізму,ані самым сябрам гэтай „арганізацыі." Беларуская люднасьць жыве сваім жыцьцём беларускім, як-бы ня чуючы і ня бачачы полёнізацыйных высілкаў кс. Ганусоўскага.

Журня.

ЦЯЖКІ ЗАГАД ВОЙТА.

в. Сташулі, Леонпольскай гм., Браслаўскага пав. Дня 31.VIII с. г. прыехаў у нашу вёску Леонпальскі войт, які ў 1927 г. вёў у нас „амэрыканскую шашу" і загадаў правіць дарогу. Дарога гэная прылягала да ракі, дык трэба і берагі замацоўваць. Работы многа. А тут і з поля зьбіраць трэба, бо ўсё пад дажджамі гніе і сеяць жыта пара. Але войт на гэта не зварочвае ўвагі, прыказвае правіць дарогу і баста. Нашы людзі не працівяцца памагчы гміне направіць дарогу, але не ў такі рабочы час. Гэны наглы загад войта людзі розна тлумачаць. Адны кажуць, што раптоўная направа дарогі патрэбна кс. Барадзічу, які вельмі часта катаецца па ёй на сваім аўтамабілі, а другія кажуць, што войт прырэк кс. Барадзічу да яго выезду дарогу направіць, а Барадзіч па напраўленай дарозе пакажа ходнасьць свайго аўтамабілю. Як яно ёсьць, хто там ведае, але сялянам бяда. Каб не ў такі рабочы час, дык так яно, а ў такую пару, дык проста згуба.

Можа рэдакцыя дарадзіць, што рабіць, каб адлажыць гэтую папраўку хоць на два тыдні?

Ад Рэдакцыі: Падайце заяву аб разглядзе гэтай справы ў Гмінную Раду і падайце просьбу ў Старастве аб адтэрмінаваньні.

ЗЯМЕЛЬНЫ ГОЛАД.

Сідра, Сакольскага пав. У нас таксама, як і ў іншых паветах беларускіх, побач з вялікімі дварамі рассеяны поўналюдныя вёскі, У дварох на вялікіх абшарах сядзяць польскія паны, а ў вёсках, на дробненькіх палосістых гаспадарачках, жывуць вялікімі сем'ямі беларусы. Рэформы зямельнай вымагае само жыцьцё, але яе ў нас праводзіць і ня думаюць. Праўда, робяць нешта з зямлёй, але беларускаму селяніну гэта ня йдзе на карысьць. Гэтая работа з зямлёй нішто іншае, як звычайнае польскае асадніцтва. Як прыклад: у Дубніцы высекалі лес і засялілі мазурамі, а беларусы далей галадуюць на зямлю.

Я. Т.

ПАЛЯНІЗАЦЫЙНАЯ РАБОТА.

в. Далёкія, Браслаўскага пав. У нашай парахвіі за паўгоду зьмянілася аж трох

пробашчаў. Усе яны, кожны пасвояму, пачыналі будаваць касьцёл. Першы зьбіраўся будаваць касьцёл з пустакоў, а другі хацеў паставіць касьцёл дзераўляны. Не залатвіўшы фармальнасьцяў будовы, загадаў накупляць дзерава і зьвязьці на месца будовы. Прыехаў трэці пробашч, які аб будове касьцёлу ня мае часу і падумаць. Ён пачаў „будаваць“ нейкі „апарат“, якім маецца ў беларускай ды літоўскай моладзі заглушаць прыродны нацыянальны дух і перарабляць яе на палякоў. Гэтую сваю работу наш ксёндз называе „каталіцкай акцыяй“, але яна афіцыяльна называецца „Стowaжышэне Млодзежы Польскей“. Нашы людзі на гэтай „каталіцкай акцыі“ скора пазналіся і ў ксяндзоўскае „кола млодзежы“ ані хто ані нагой ня ўступае. Налавіў наш ксяндзок некулькі шляхтункоў у сваю акцыю і з імі там яе й праводзіць. Далей шляхоцкай хаты гэтая ксяндзоўска-польская акцыя не пашыраецца. Тут трэба іншых працаўнікоў — трэба ксяндзоў беларусаў і ліцьвіноў, а каб пашырыць каталіцкую акцыю, трэба, каб яна была сапраўды каталіцкай, а не шовіністычна-польскай.

М. Бяздольны.

ГМІНА і КАСЬЦЁЛ.

Празарокі, Дзісьненскага пав. Кепскае параўнаньне касьцёлу з гмінай, але яны ў нас блізка што аднолькава выконваюць заданьне. Гміна польшчыну заводзіць пасвояму, а ў касьцеле ксёндз ізноў пасвояму.

Дня 29.VI. у Празароцкім касьцеле прыпадае вялікае сьвята. На гэту ўрачыстасьць зьбіраецца многа людзей, каб памаліцца Богу. Пры гэтай нагодзе і ксёндз наш мае работы. Надта шчыра „працаваў“ ён сёлета на гэтай урачыстацьці. Мусіць быў пастанавіўшы ў гэты дзень адным узмахам зрабіць нашу парахвію польскай. Як толькі кончылася набажэнства, ксёндз „прыпусьціў“ свае сілы і спрыт проціў беларускасьці. Сьпярша крычаў, каб ня чыталі „Бел. Крыніцы“, пасьля гразіў, каб не давалі дзецям і моладзі беларускіх кніжак чытаць, а ў канцы назваў усё, што ёсьць беларускае—камуністычным, а беларусаў—камуністымі і паказаў дарогу „збаўленьня“ праз „Стowaжышэне Млодзежы Польскей“. Рэч ясная, што на гэткую чаўпню людзі паківалі галовамі і пайшлі, як вылаяныя да хаты. Можа хто падумае, што ў гэтым ксяндзоўскім „стowaжышэні“ шмат моладзі ёсьць. Але дзе там. Наша беларуская моладзь туды ня йдзе, а дзеля гэтага так і злуецца на беларусаў ксёндз-паляк.

Гміна — інстытуцыя іншага характару, дык там і іншым спосабам робіцца польская работа. Войтам у нас можа быць толькі чалавек з павагай — асаднік, пан або шляхтун. Сьпярша быў войтам асаднік, але здарылася нейкая дэфраўдацыя, якой, як казалі, налічылі аж 27 тысяч зл.

Гэты пан зрабіўшы такую штуку пашоў „аддыхаць“. На яго месца „выбралі“ пана Ст. Гэты пан пакуль ня быў войтам, дык і пабеларуску гаварыў з сялянамі, а цяпер ён сусім зьмяніўся. Цяпер гоніць нашу моладзь у „стшэльцы“ і стараецца накінуць нам польшчыну, каб беларускасьці ня відзець і ня знаць.

Дык вось як у нас робіцца. Ксёндз цягне ў „стowaжышэне польске“, а войт прэ ў „стшэльцы“. На наш пагляд, дык нам не па дарозе ані з ксяндзоўска-польскім „стowaжышэнем“, ані з польскім „стшэльцам“ Нам трэба сваей арганізацыі, прыкладам Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры.

Гіндзік.

З Вільні.

Цікавы суд. Дня 22 верасьня с, г. адбудзецца ў Віленскім Акружным Судзе вельмі цікавая судовая справа Віленскай Праваслаўнай Духоўнай Консысторыі з студэнтам Сарокам.

Суд гэты ёсьць цікавы тым, што на гэтым судзе будуць разглядацца ведамыя і нашумеўшыя аднаднёўкі, выданыя ў Вільні, у якіх гаворыцца аб Віл. Прав. Дух. Кансысторыі і аб духоўніках Праваслаўнай Віленскай Епархіі.

Да рэдактарства і выдавецтва гэтых аднаднёвак прызнаўся сам сэкрэтар Беларускага Праваслаўнага К-ту, студэнт Сарока і ў адкрытым пісьме ў „Сьветачы Беларусі“ вапрапанаваў абражаным аднаднёўкамі падаць яго ў суд.

Пасьля гэтага Віленская Праваслаўная Дух. Кансысторыя ськівавала справу ў суд з просьбай пакараць Сароку паводле 154 арт. к. к.

Справа будзе разглядацца з прыватнага абвінавачаньня Прав. Дух. Кансысторыі.

Гэтая справа вельмі цікавая і тым, што Сарока зьбіраецца даказаць беспадстаўнасьць акту абвінавачаньня і пацьвердзіць фактамі сказанае ў аднаднёўках.

X.

Разьвітаньне з б. віцэ-ваяводам Кіртіклісам. У нядзелю 6 г. м. некаторыя віленскія арганізацыі і інстытуцыі наладзілі ўрачыстае разьвітаньне выехаўшаму з Вільні на віцэ-ваяводу ў Лодзь б. Віл. віцэ-ваяводу Кіртіклісу і яго жонцы пасланцы з Б.Б. п. Яніне Кіртіклісовай.

Гэная ўрачыстасьць складалася з акадэміі і раўту. Беларускі „Цэнтрасаюз“ на гэтай акадэміі і раўце рэпрэзэнтавалі старшыня „Цэнтрасаюзу“ Трэпка і Радаслаў Астроўскі.

А.

Ab haspadarcy.

Haspadarka ŭ vosieni.

Siaŭba aziminaŭ jošć najvažniejšaj vasieńniaj pracy u poli. Nielha tolki z jej ściahivać i da kanca m-ca vieraśnia treba abaviazkava z joj być hatovym. — Uśled za siaŭboj aziminaŭ prychodzić kapańnie bulby i inšych akopninaŭ. Uvažnaje pierabirańnie vykapanaj bulby zrazu-ž na poli jošć varunkam dobraha pierachavańnia jaje praz zimu. Chto choča mieć dobruju bulbu na sadźbu, toj niachaj nie palanujecca i, zahadzia aznačyŭšy kałočkami ci ščepkami dobra raźvityja i z d a r o v y j a kalivy, kapaje ich i pierachovyvaje asobna. — Tak ci jnakš vykapaŭšy bulbu treba z pola zaŭsiody staranna vybrać usio, što tolki tam paśla bulby astajecca: nadapsutyja i hniłyja bulbiny, bulboŭnik i ŭsiakaje miaćvie. Usio heta najlepš byvaje spalić, a popieł — skompostavać, bo ŭ hetych adpadkach zvyčajna mieściacca i z imi raznosiacca ŭsiakija škodniki polnaj haspadarki. — Jak bulbianišča, tak buračanišča i asabliva aržyšča pa azimych i jaravych zbažžavinach musiać być na zimu (m-cy krasavik — listapad) hłybaka pieraarany *i pakinieny na maroz u vostraj baraźnie* (*niezabaranavanymi*). Treba tolki zapeŭnić na ŭsich paloch i sienažaciach dobry adpłyŭ dla vasieńniaj i viaśnianaj vodaŭ, kab nie tvarylisia škodnyja zatopy, Ciapier tak-ža adpaviedny čas na prakapańnie asušajučych ravoŭ na paloch, sienažaciach i paśbiščach. Zakvaśnieŭšyja ad nadbytku vohkaści miajscy, pieradusim asušyŭšy ich uvosieni taksama najlepš zvapnavać. Na ha lahčejšych hruntoŭ navoziać 10—15 q (60-90 pudoŭ) palenaj vapny. Na ciažejšyja hrunty (hlina, hlej) dajuć na ha 20-25 q (120—150 pudoŭ) palenavapny. Vapnu hetu razvoziać pa poli i abo rasjsypajuć małymi kopčykami, prykryvajučy ich š č y l n a ziamloj na 2-3 tydni, kab vapna adhasiłasia sama i paśla roŭna jaje rastrasajuć pa ŭsim poli i prykryvajuć, abo takuju vapnu prosta z vaza nasypajuć u placionyja košyki, zataplajuć u vadzie (adhašajuć) i — rassypaŭšy pa poli — pieramiešyvajuć z hlebaj. Pry apošnim sposabie praca moža jšci šparčej, ale treba mieć pad rukoj dosyć vady. — Sienažaci najlepš uvosieni pahnaić kainitam i tamasšlakam (tamasynaj) i zabaranavać. Treba na zimu taksama razbaranavać uvieś hnoj paśla paśviŭšajsia žyvioły.

Ždzičeŭšyja sienažaci, a navat i dzirvany, kali tolki jany nie na sypučym piasku, dobra dajucca ŭvosieni admaładzić. Ich treba pieradusim vykarčavać z roznych kustoŭ, muraviejniki, krotavy kapcy i inšyja kurhany pazraŭniać i ŭsio heta na zimu hłybaka pieraarać. Viasnoj takoje „novapole“ treba dobra vybaranavać (najlepš — spranžynoŭkaj) i zasieić u pieršym hodzie aŭsom, abo hrečkaj. Na druhi hod najlpš tudy dać bulbu. Bulbianišča ŭvosieni pieraarecca, budučy prad tym zvyčajna zvapnienym, a viasnoj sieicca, abo jačmień, z usieŭkaj kaniušyny, abo i samaja tolki mnohaletniaja miašanka kaniušyny z karmavymi travami...

Uvosieni treba vyvieźci i zaarać hnoj pad bulbu. Zaarać taksama treba pad jarynu łubin i seradelu.

Bolš uvahi zasłuhoŭvuje sad i harod. U sadzie za s u c h a źbirać treba zimovyja sarty sadoviny: jabłyki i ihruški. Sadovinu treba abirać dałaziačy da jaje pry pomačy drabinaŭ, abo pasłuhoŭvajučysia adumysłovymi šastami z ščypcami na kancoch. Traści, abo abivać sadovinu nielha, bo sama sadovina hetak sabranaja — niatryvałkaja, a hałoŭnaje, vielmi niščacca ad hetaha samyja drevy i najmienš hod paśla musiać „čuchacca,“ ničoha nia rodziačy. — Staryja fruktovyja drevy ŭvosieni možna admaładzić, skaračyvajučy biaspłodnaje staroje suččo, na miejsca jakoha za paru hadoŭ naraście pładanosnaje novaje suččo. Tolki nielha za adzin raz abcinać usich sukoŭ, a razłažyć hetu pracu na 2-3 hady. Ziamlu ŭvokał dreŭ — jak šyroka siahajuć haliny karony — treba ŭskapać i pahnaić. Na tymža prastory ad pnioŭ fruktovych drevaŭ vostrymi kałkami robiacca ŭ ziamli dziury, u katoryja zalivajecca hnajnica (mača z-pad hnoju). Maładyja dreŭcy treba zabiaśpiečyć ad hryzunoŭ (zajcaŭ i trusoŭ). Pad viaśnianaje zasadžyvańnie ŭščepaŭ ciapier treba vykapać jamy.

U harodzie, taksama jak na bulbianiščach, treba paźbirać usie reštki pa harodninie i abo ich skarmić, abo spalić i skompostavać. Samuju ziamlu treba na zimu hłybaka pieraarać, abo pierakapać.

Svojskuju žyviołu treba ŭ čas pryvučać da suchoha kormu ŭ chlavie. Paśvić treba jak najdaŭžej, ale z zaściarohaj, što nia budzie paśvicca ani na razmokšych sienažaciach, ani na abmarožanym kaniušyniščy: u pieršym vypadku niščycca vielmi sienažać, a ŭ druhim — niebiaśpieka dla cielnych karoŭ, jakija ad hetkaj pašy mohuć „škinuć.“ Staranna treba pryhatavać chlavy na zimavańnie ŭsiaje svojskaje žyvioły: treba ich abhledzić, kab byli ciopłymi i zdarovymi. Bialeńnie chlavoŭ z siaredziny vapnaj, z uvahi na mahčymuju niebiaśpieku rožnych zaraźlivych chvarobaŭ, jošć kaniečnaściu. U skaciny, kozaŭ, aviečak i šviniej u hetym časie najčaściej spatykajecca nia hetulki niebiaśpiečnaja, kolki dakučlivaja chvaroba j a š č u r: nad samaj rahovaj častkaj kapyta, a tak ža na hubach, dziasnach i jazyku žyvioły źjaŭlajucca spačatku śvietła vadzianistyja, paśla mutnyja vadyry, jakija niezadoŭha łopajuć i pavoli hojacca... Žyvioła pry hetym haračkuje, tracić apetyt da ježy, z trudom pierachodzić z miejsca na miejsca... Baranicca ad jaščura treba starannaj čystatoj i akuratnaściu: chleŭ treba vybialić, žyviołu — nia puskać u pole, kormiačy jaje doma i pramyvać jej kapyty i zuby (dziasny, jazyk, huby) rastvoram kreoliny ŭ vadzie (litr kreoliny na 20 litraŭ vady). U chleŭ nielha dapuskać nikoha pastaronnaha, a i sama asoba dahladajučaja žyviołu musić ścierahčysia ŭsiakaje styčnaści z čužymi ludźmi.

U čas treba razrachawać zapasy kormu dla žyvioły, a samuju žyviołu staranna čyścić i što dnia, prynamsia na hadzinku, puskać na volnaje pavietra. Z kancom listapada treba pakrywać šviniej, kab rańniaj viasnoj (za 120 dzion) mieć parasiat.

Nielha tak-ža zabyvacca i ab sobskaj chacie. Abhledzić treba vokny, dźviery, piečy, k o m i n y i strechi. Na ŭsiaki vypadak treba na zimu abzapasicca vapnaj i piaskom. Zapas droŭ na zimu nikomu jašče nie paškodziŭ.

inž. A. K.

Наша пошта.

Б е л ю к у. З Вашага пісьма відаць, што Вы прачулены беларускай справай. Праўда, цяжкі лёс нашага народу, дык трэба і працаваць, каб гэты лёс папpавіць. Ці мы асабіста дачакаем таго шчасьця, каб пабачыць свой народ вольным—не павінна нас мучыць. Наш абавязак рабіць усё тое і ісьці тым шляхом, які зблізжае да волі народу. Просьбу споўнілі, з весткі карыстаем. Аптэкі зьмяняць ня радзім, бо ў Варшаве лякарствы хіба таней як у Вільні.

„Б е л. К р ы н і ц у“ пасылаем з 1.IX: Я. Савіцкаму, В. Окушко і Т Асіповічу ў Вялейку.

О т о к а. Газэту Вам пасылаем і высылаем каталёг беларускіх кніжак.

Б у л ы г у. За весткі дзякуем, друкуем.

В. Б. Такога зьместу карэспандэнцыі зьмясьціць ня можам, бо аскаржылі-б гаспадара ігрышча. А тое, што кам. дастаў па носе, дык няхай і трымаецца. Ня варта ваўка з лесу выклікаць.

Я к у б ё н к у. Вам газэту пасылаем акуратна. Чаму Вы не атрымліваеце—ня ведаем, трэбуйце на пошце.

Б я з д о л ь н а м у. Дзякуем, карыстаем скарміціўшы з недахопу мейсца ў газеце. Пішыце больш.

Г і н д з ю к у. У Вільні ёсьць гандлёвы інстытут, сярэдняя гандлёвая школа і гандлёвыя курсы. Гандлёвай III клясовай школы няма. За прысланае дзякуем, карыстаем.

П у п і н у. Рэшту грошай вышліце, калі будзеце мець. Параду пасылаем, вестка ўжо неактуальная — спозьненая. Пішыце больш.

Б я з д о л ь н а м у. Просьбы Вашай споўніць не маглі, бо ўжо былі высланы карты прэнумэраты. На наш пагляд сусім у цень хавацца ў барацьбе нявартa. Лепш—з павагай, адкрыта і стойка. Праўда некалі пераможа. З прысланага будзем карыстаць, пішыце больш і пашырайце, гэткім спосабам пераможаце несправядлівасьць.

Г р о ш ы а т р ы м а л і а д: Я. Ламеко 1 зл., Кадушко Т. 2 зл., Бюр. Аб'яўл. 2 зл, Гірдзея П. 2 зл., Вежбіцкага 2 зл. 50 гр. і Скрыпскага Ю. 1 зл. Дзякуем, газэту пасылаем.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.